# За дасягненне высокіх вынікаў

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ "Аб занясенні на Рэспубліканскую дошку Гонару пераможцаў спаборніцтва за 2023 год". У пачэсным спісе ёсць і ўстановы сферы культуры.**

Указам № 174 ад 24 красавіка вызначаны 64 пераможцы з ліку рэгіёнаў і арганізацый, удастоеныя занясення на Рэспубліканскую дошку Гонару за дасягненне высокіх вынікаў у сферы сацыяльна-эканамічнага развіцця ў 2023 годзе.

Сярод найлепшых — 11 адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак. Гэта Брэсцкая і Мінская вобласці, горад Мінск, а таксама Баранавіцкі і Камянецкі раёны Брэсцкай вобласці, Астравецкі — Гродзенскай, Нясвіжскі і Салігорскі — Мінскай. Акрамя таго, адзначаны Ленінскі раён Брэста, Маскоўскі і Цэнтральны раёны беларускай сталіцы.

Яшчэ на Рэспубліканскую дошку Гонару будуць занесены 11 прамысловых арганізацый, тры арганізацыі, якія ажыццяўляюць дзейнасць у будаўніцтве, дзевяць арганізацый сельскай і рыбнай гаспадаркі, дзве — лясной, 28 — сферы паслуг (арганізацыі гандлю, адукацыі, аховы здароўя, навукі, культуры, сацыяльнага абслугоўвання ды іншыя).

Што датычыцца нашай галіны, то ў спісе пераможцаў значацца тры яе прадстаўнікі — Палац Рэспублікі, Нацыянальная бібліятэка Беларусі і Гомельскі абласны музей ваеннай славы.

Занясенне на Рэспубліканскую дошку Гонару сведчыць аб грамадскім прызнанні важкага ўкладу рэгіёнаў і калектываў прадпрыемстваў у сацыяльна-эканамічнае развіццё і рост дабрабыту краіны. Гэта стымул для дасягнення яшчэ больш высокіх вынікаў у будучыні.